# Пачатак і заканчэнне Другой сусветнай вайны

# 1 верасня 1939 года: Пачатак знішчэння

Урок
90 хвілін

Дадатковы
матэрыял

Аналіз

# Прайшло 80 год з даты ўварвання ў Польшчу, але нямецкае грамадства па-ранейшаму не можа прыйсці да згоды па пытанні злачынстваў Германіі.

Фелікс Акерман, 30 жніўня 2019 г.

1 верасня 1939 года Германія ўварвалася на тэрыторыю сваёй суседкі Польшчы. Напад з самага пачатку суправаджаўся шырокамаштабнай бамбардзіроўкай гарадоў, мэтанакіраваным знішчэннем польскай эліты праз арышты, дэпартацыі і расстрэлы, а таксама гвалтам на расавай глебе, які, у прыватнасці, быў накіраваны супраць грамадзян Польскай Рэспублікі яўрэйскага паходжання.

Далучаны рэгіён “Вялікая Польшча” стаў лабараторыяй для стварэння «жыццёвай прасторы для нямецкага народа». Гэты рэгіён быў уключаны ў зону, вядомую як «Вартэгау» (Warthegau) [кароткая форма тэрміна «Рэйхсгау Вартэланд» / Reichsgau Wartheland – польскай тэрыторыі, акупаванай Германіяй з 1939 па 1945 гг.], адкуль гвалтоўна перамяшчалася славянскае і яўрэйскае насельніцтва, на месца якога засялялі этнічных немцаў. Тут была прадоўжана практыка сістэматычнага знішчэння хворых людзей, якая ўжо выкарыстоўвалася ў Германскім рэйху. Эксперыменты з выкарыстаннем газу для масавых забойстваў хворых людзей садзейнічалі далейшым напрацоўкам, што папаўнялі нацысцкі арсенал забойчай зброі. Так як Германія яшчэ больш радыкалізавалася пасля нападу на СССР, у нацысцкіх лагерах смерці, якія месціліся на тэрыторыі Польшчы, пачалі ўжываць газ. Польскія грамадзяне складалі больш за палову ад агульнай колькасці ахвяр Халакосту, роўнай 6 мільёнам чалавек.

Нямецкія акупанты з самага пачатку бачылі ў Варшаве сімвал польскага супраціву, які трэба было зламаць у ходзе «Польскай кампаніі». Менавіта таму бомбы былі скінутыя на грамадзянскія аб’екты ў цэнтры Варшавы яшчэ ў пачатку верасня 1939 года. Супраціў жыхароў горада выліўся ў два паўстанні: у красавіку 1943 года ў гета і ў жніўні 1944 года, які ахапіў увесь цэнтр горада. [...]

**Што стаіць за датай 1 верасня 1939 года?**

Уварванне на тэрыторыю Польшчы стала пачаткам не толькі знішчэння цэлых польскіх супольнасцей, але і пачаткам маштабнага самазнішчэння нямецкага грамадства. Вельмі значная колькасць жыхароў усходніх раёнаў Германскага рэйха ўжо ў 1933 годзе прагаласавала за НСДАП, але з 1 верасня 1939 года сімвалічны тэрор, які да таго часу ўжо вызначаў штодзённасць унутры рэйху, разгарнуўся ва ўсю моц і фізічна – супраць цэлай суседняй краіны. І ў 2019 годзе ўзнікае пытанне: ці вялікая колькасць нашчадкаў перамешчаных немцаў, якія разумеюць, што страта радзімы была, па сутнасці, следствам падпісання Дамовы (Пакта) Гітлера—Сталіна? За тыдзень да 1 верасня СССР і Германскі рэйх дамовіліся паміж сабой аб падзеле Польшчы. Лінія, узгодненая дадатковым сакрэтным пратаколам, прадугледжвала прасоўванне на захад ад усходняй мяжы Польшчы. Сталін не меў намеру вызваляць усходнія польскія тэрыторыі, заваяваныя ў ходзе папярэдняй савецка-польскай вайны (гэтыя тэрыторыі цяпер уваходзяць у склад Беларусі, Украіны і Літвы), ад савецкай улады. Ужо 17 верасня 1939 года Чырвоная армія акупавала ўсход Польскай Рэспублікі, і ў польскага кіраўніцтва не засталося іншага выйсця, акрамя як бегчы ў Лондан. [...]

Праз пяць гадоў і мільёны загінулых пазней, калі фронт зноў перасек усходнюю мяжу Другой Польскай Рэспублікі, нямецкія часткі зноў пакінулі за сабой выпаленую польскую зямлю. [...] Колькі немцаў ведае пра тое, што пасля падаўлення паўстання, 75 гадоў таму, дом за домам па ўсёй Варшаве наўмысна падпалілі, каб сцерці з твару зямлі гэты горад мільёнаў?

**Прабелы/лакуны ў нямецкай памяці, датычныя да карціны знішчэння**

У нямецкім грамадстве варта больш гаварыць [...] пра злачынствы немцаў у Польшчы. Паваенная гісторыя падзеленай Германіі – адна з прычын распаўсюджанага няведання пра падзеі, якія пачаліся ў Польшчы 1 верасня 1939 года. [...]

У большасці нямецкіх сем'яў, чые бацькі вярнуліся з палону, нічога не распавядаюць пра перажытае ва Усходняй Еўропе. Большасць замоўчвала аб'ёмы і ступень гвалту ў Польшчы і СССР. З чаго можна было б пачаць працу ў галіне памяці ў 2019 годзе? У многіх нямецкіх сем'ях па-ранейшаму захоўваюцца на гарышчах ці ў падвалах фотаальбомы, якія, па меншай меры, дапамогуць атрымаць уяўленне пра тыя месцы, дзе былі іх дзядулі. [...]

Тыя ж, хто хоча даведацца больш пра месцы знаходжання сваіх продкаў падчас вайны, могуць звярнуцца з запытам у Федэральны архіў. [...] Базы дадзеных уліку нямецкага Чырвонага Крыжа і Народнага саюза Германіі па доглядзе за вайсковымі пахаваннямі могуць праліць крыху святла для тых, чые дзядулі не вярнуліся з вайны. Інфармацыя, якая там захоўваецца пра асобных салдатаў і месцах іх службы/знаходжання [...] дапамагае нам зразумець, што акупацыя Польшчы ажыццяўлялася людзьмі, якія там ваявалі. Нацыянал-сацыялізм не быў абстрактнай ідэалогіяй; гэта быў светапогляд, які многія немцы прынеслі ў вайну ў сваіх рэчавых мяхах. Лісты з фронту, многія з якіх захоўваюцца ў сямейных архівах, служаць таму сведчаннем. У многіх з іх салдаты і афіцэры вермахта пішуць у верасні 1939 года пра сваю вялікую радасць у сувязі з немінучай паразай ворага на Вісле.

**Памятайце пра Польшчу**

У 2019 годзе запланаваная грамадская дыскусія на тэму таго, як нямецкае грамадства павінна «памятаць» польскіх ахвяр Другой сусветнай вайны. [...]. Ці павінна Германія па-ранейшаму, праз 80 гадоў пасля пачатку вайны, памятаць асобна пра кожны народ/краіну, пацярпелых ад нацысцкага тэрору? Крытыкі асцерагаюцца мноства індывідуальных ініцыятыў памяці і канкурэнцыі за гістарычнае прызнанне – канкурэнцыі «палітыкі ідэнтычнасцей». Тым не менш дыскусія сама па сабе сведчыць пра тое, што ў 2019 годзе па-ранейшаму няма шырокай грамадскай згоды ў пытанні значэння і характару падзей 1 верасня 1939 года – згоды ў тым, што ў гэты дзень быў здзейснены напад на Польшчу, які павінны быў сігналізаваць аб канчатковым (паўторным) знікненні нацыянальнай дзяржавы Польшчы з карты Еўропы. Тое была спроба знішчыць цэнтральнаеўрапейскую дзяржаву, ператварыўшы цэлую краіну ў зону знішчэння. Усё гэта вынікае з даты 1 верасня 1939 года, а не проста першы ўдар па Польшчы. Калі б разуменне гэтага ўжо было часткай нямецкай культуры памяці, наўрад ці б хтосьці голасна сумняваўся ў неабходнасці мемарыяла ў памяць пра гэтую падзею. Зрэшты, цэнтр дакументацыі таксама будзе вельмі неабходны для разумення кантэксту.

*Тэкст прыведзены са скарачэннямі з дазволу д-ра Фелікса Акермана / апублікаваны на сайце Фонду імя Генрыха Бёля*

904 словы

Крыніца: Felix Ackermann, 1. September 1939: Der Beginn der Zerstörung,
https://www.boell.de/de/2019/08/30/1-september-1939-der-beginn-der-zerstoerung
Дата апошняга наведвання: 21.01.2021 г.